ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 299 (1266) | СУБОТА, 27-га сьнежня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 .
6 месяцаў . . . 1 р. 80 .
1 год . . . . 3 р. 30 .
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

На першай агульна-гарадзкой партыйнай конфэрэнцыі гораду Менску

Учарашняе вячэрняе пасяджэньне конфэрэнцыі пачалося спрэчкамі па дакладу тав. Гея.

У спрэчках выступілі наступныя т. т. Лінц, Гінзбург, Саевіч, Гласкоў, Хаськін, Дзеціна, Шалкавец, Маклок, Кароль, Кумкіс.

Канфэрэнцыю віталі шматлікія дэлегацыі рабочых ад менскіх прадпрыемстваў, асьветнікаў, VIII-га зьезду камунальнікаў.

З адказным словам ад партканфэрэнцыі на прывітаньні рабочых дэлегацый выступіў адказны рэдактар ЦО КП(б)Б „Зьвязда" тав. Будзінскі.

ПРАВЕРКА ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ—
ПАРУКА ПОЎНАГА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЯ ЗАДАЧ ПАРТЫІ

Праверка выкананьня—гвозьдзь работы

Музыкай перамагаючага социялізму гучаць пабудаваныя лічбы народнай гаспадаркі на 1931 год.

49 мільярдаў рублёў народнага прыбытку, 45 процантаў прыросту прамысловай продукцыі, 12,7 мільярда гадзін электраэнэргіі, 143 мільёны га насеўных плошчаў, 80 проц. ахоп колектывізацыяй сялянскіх гаспадарак на асноўных збожжавых раёнах—гэткія асноўныя задачы ў 3 годзе пяцігодкі. Нябачаныя ні ў адной краіне тэмпы росту народнай гаспадаркі СССР у другім годзе пяцігодкі становяцца яшчэ больш высокімі, і галоўнейшай задачай, якая падпарадквае сабе ўсе астатнія, зьяўляецца зараз задача забесьпячэньня новых бурных тэмпаў социялістычнага будаўніцтва.

Што патрэбна для рашэньня гэтай, асноўнай зараз, задачы?

Неабходна ў першую чаргу яшчэ большае ўмацаваньне дысцыпліны, поўнае і безагаворачнае выкананьне ўсіх дырэктыў цэнтра усімі органамі пролетарскай дзяржавы, усімі зьвеньнямі апарату пролетарскай дыктатуры. Неабходна ў першую-ж чаргу ва ўсіх галінах социялістычнага будаўніцтва „цэнтр цяжару перанесьці на падбор людзей, на праверку фактычнага выкананьня" (Ленін).

Практыка работы савецкага апарату паказвае, што выкананьне важнейшых дырэктыў партыі і савецкага ўраду натыкаецца на натуральныя перашкоды. Надта яскравыя факты адсутнасьці дакладнага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду выкрыла праводзімая чыстка савецкага апарату. Ня толькі ў мясцовых—раённых, абласных, але і ў значнай частцы цэнтральных установаў-апаратах Наркаматаў СССР і Саюзных рэспублік—чыстка выявіла, што дзесяткі дырэктыў буйнейшага значэньня альбо проста ня выконваюцца, альбо скажаюцца работнікамі гэтых апаратаў. Прычыны скажэньняў, прычыны слабасьці выкананьня дырэктыў ляжаць перш за ўсё ў засьмечанасьці многіх нашых апаратаў людзьмі чужымі, проста варожымі пролетарыяту, социялістычнаму будаўніцтву. Клясавы вораг—шкоднікі з „Прампартыі", кандрацьцеўцы, меншавікі—залезшыя на адказьнейшыя вучасткі савецкага апарату—натуральна імкнуўся сарваць выкананьне дырэктыў партыі, прыкладаючы ўсе і ўсялякія натугі для таго, каб затармазіць пераможны ход будаўніцтва социялізму. Шкоднікі былі не адзінокія. Ім дапамагалі, іх „лінію" спрабавалі праводзіць у дзяржапараце правыя опортуністыя, якія імкнуліся рэалізаваць кандрацьцеўскую стаўку на кулака ў сельскай гаспадарцы, лямантуючы аб „непасільных тэмпах" росту прамысловасьці, аб „пераабкладаньні прыватніка" (органы наркомфіну), аб немагчымасьці будаўніцтва коопэрацыйных гародаў, малочных фэрм (Цэнтрасаюз) і інш. і інш.

Клясавы вораг—шкоднікі і яго агэнтура—опортуністыя насаджалі і памнажалі элемэнты бюрократызму ў рабоце савецкага апарату, патуралі і імкнуліся ўзаконіць бяздушна-чыноўніцкія адносіны работнікаў дзяржапарату ў выкананьні дырэктыў партыі і ўраду, падмяняць фактычнае выкананьне папяровым, формальным.

Ліквідацыя шэрагу шкодніцкіх організацый, выганьне дзесяткаў тысяч нягодных чыноўнікаў і опортуністых з савецкага апарату, вылучэньне на замену вычышчаным новых папаўненьняў з перадавых пролетараў значна па епшылі працу апарату. Адначасова рост социялістычнага будаўніцтва, рост плянавасьці даў магчымасьць палепшыць структуру, выкінуць шэраг зьвеньняў, значна скараціць штаты і патаніць кошт апарату. У барацьбе з бюрократызмам на гэтым важнейшым вучастку фронту клясавай барацьбы" партыя дасягнула значных вынікаў, асабліва за апошні час. Гэтыя перамогі не азначаюць, зразумела, што бюрократызм у нашай краіне пераможаны, ліквідаваны, што барацьба з бюрократызмам закончана.

Апроч супраціўленьня клясавага ворага і яго агентаў—опортуністых яшчэ ня зьнішчаны цалкам экономічныя карэньні бюрократызму ў нашай краіне. Ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну выкрывае экономічныя карэньні бюрократызму ў савецкім апараце, расчышчае дарогу перамозе социялізму. Але самае ажыцьцяўленьне бальшавіцкай програмы трэцяга году пяцігодкі патрабуе ўзмацненьня барацьбы з бюрократызмам і ў першую чаргу пасіленьня праверкі фактычнага выкананьня гэтай програмы ўсімі савецкімі органамі. „Праверка выкананьня—цьвік работы„—гэтае ўказаньне Леніна зараз, калі мы ўступаем у пэрыод социялізму, ня толькі ня губіць сваёй вастрыні, але і, наадварот, набывае асабліва важнае значэньне. Важнейшай умовай посьпеху социялістычнага плянаваньня зьяўляецца суравейшая дысцыпліна ва ўсіх зьвеньнях савецкай сыстэмы. Барацьба з носьбітамі права-опортуністычнай практыкі ў тых альбо іншых зьвеньнях апарату патрабуе ўзмацненьня штодзённай чоткай праверкі практычнага выкананьня. Менавіта гэтая задача—організацыя на ўсіх зьвеньнях апарату пролетарскай дыктатуры зьверху да нізу чоткай праверкі фактычнага выкананьня ўрадавых дырэктыў—зьяўляецца асноўнай галоўнай задачай нова створанай высока-аўторытэтнай „камісіі выкананьня" пры Савнаркоме СССР.

Задача чоткай праверкі выкананьня зьверху да нізу стаіць ня толькі перад дзяржаўным апаратам, але і перад усімі профсаюзнымі, коопэрацыйнымі і партыйнымі нашымі органамі. Дзеля гэтага ў склад „камісіі выкананьня" уключаны аўтарытэтныя прадстаўнікі ня толькі ЦК партыі, але і УсеЦСПС і Колгасцэнтру, кіруючымі масавымі організацыямі мільёнаў пролетараў і колгасьнікаў. Стварэньне гэтай камісіі выцякае з рашэньняў XVI зьезду ЎсеКП(б): „буйнейшыя посьпехі социялістычнага будаўніцтва,—культурна-політычны рост пролетарыяту і станоўчы вопыт прыцягненьня шырокіх мас да чысткі апарату робіць магчымым і неабходным пераход у разгорнутае наступленьне на бюрократызм, які тармозіць тэмпы нашага разьвіцьця, на падставе карэннай перабудовы савецкага апарату і агульнай штодзённай праверкі выкананьня дырэктыў партыі і ўраду".

Што патрэбна для пасьпяховасьці работы новастворанай „камісіі выкананьня", для сапраўднай усёпранікаючай праверкі фактычнага выкананьня. Дзеля гэтага неабходна поўнасьцю рэалізаваць патрабаваньні Леніна аб устанаўленьні „самай дакладнай адказнасьці кожнага, хто стаіць на любой савецкай пасадзе, ці за выкананьне пэўных ясных і не двухсэнсоўных адказных заданьняў і практычных работ Выкананьне гэтага правіла, без якога немагчыма правядзеньне сапраўднага кантролю і падбор найбольш падыходзячых асоб на кожную пасаду і на кожную работу павінна стаць з гэтага часу бязумоўна абавязковым".

Ажыцьцяўленьне гэтага патрабаваньня—неабходная ўмова магчымасьці сапраўднай праверкі. Пад гэтым менавіта кутом погляду неабходна зараз нанова перагледзець сваю структуру кожнай савецкай установе, кожнаму зьвяну савецкага апарату. Рэалізацыя гэтага патрабаваньня палягчае праведзеная партыяй ліквідацыя акруг рэорганізацыя апарату шэрагу наркоматаў, крэдытная рэформа і шэраг іншых мерапрыемстваў буйнейшага політычнага значэньня, праведзеных у апошнія гады.

Асабліва важнае значэньне мае ліквідацыя акруг Паварот тварам да раёну усіх нашых організацый яшчэ ў патрэбнай меры не ажыцьцяўлёны. А між тым, іменна раён,—зараз галоўнейшае зьвяно правядзеньня ўсёй політыкі партыі. Рэорганізацыя ўсяго савецкага апарату ўжо ў значнай частцы праводзіцца. У трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, неабходна завяршэньне гэтай рэорганізацыі, ажыцьцяўленьне ў поўнай меры павароту ўсіх зьвеньняў апарату тварам да новых баявых задач рэконструкцыйнага пэрыоду. І ўся рэорганізацыя павінна праводзіцца іменна на падставе жорсткай праверкі выкананьня, ліквідацыі шкодніцкага і права-опортуністычнага супраціўленьня пераможнаму росту социялізму. Барацьба за суровую плянавасьць, дысцыпліна, дакладнае выкананьне дырэктыў ураду—гэткая задача „камісіі выкананьня".

Бязьлітасная барацьба з усімі, хто ў сваёй рабоце ня выходзіць з агульнага пляну социялістычнага будаўніцтва, а глядзіць на работу з „сваёй" ведамсьцевай, абласной мясцовай званіцы. Работа „камісіі", узмацненьне праверкі выкананьня павіна давесьці, натуральна, і да палепшаньня падбору людзей. Зьяўленьне элемэнтаў абломаўшчыны, непаваротнасьць у рабоце, няўменьне тых альбо іншых адміністратараў аўладаць, кіраваць даручанай ім справай, павінна будзе ўжо давесьці да палепшаньня падбору людзей, зьмяшчэньне нягодных, правільнай расстаноўкі людзкіх сіл на ўсіх вучастках социялістычнай будоўлі.

Організацыя „камісій выкананьня" ні ў якай ступені ня здымае задачы праверкі выкананьня з органаў рабоча-сялянскай інспэкцыі. У сваёй рабоце РСІ ўжо здолела прыцягнуць дзесяткі і сотні тысяч працоўных, рэалізуючы ўказаньні Леніна аб уцягненьні самых шырокіх мас у барацьбу с бюрократызмам. Кіруемае РСІ шэфства заводаў над савапаратам атрымала надта шырокае распаўсюджаньне і ахапіла ўжо сотні заводаў і фабрык. Гэтая масавая работа органаў РСІ павінна ня толькі ня згортвацца, але разгортвацца самым энэргічным чынам.

Масавы кантроль рабочых зьнізу за савапаратам (шэфства заводаў) павінен быць і будзе лепшым дапаможнікам „камісіі выкананьня", шчупальцамі партыі і савецкага ўраду тысяч савецкіх установаў. Работа „камісіі выкананьня" дасьць сапраўдную магчымасьць поўнага ператварэньня ў жыцьцё ўказаньняў Леніна аб праверцы выкананьня і падбору людзей, як цэнтральнай нашай задачай,—забясьпечыць правядзеньне поўнасьцю і цалкам бальшавіцкай програмы рашаючага году пяцігодкі, забясьпечыць выкананьне цэнтральнага лёзунгу партыі: бязьлітасная барацьба на два фронты забясьпечыць выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

(„ПРАВДА")

„Цэнтр цяжару перанесьці на падбор людзей, на праверку фактычнага выкананьня" (Ленін)

Пастанова

ЦВК і СНК СССР аб організацыі „КАМІСІІ ВЫКАНАНЬНЯ" пры СНК СССР.

На падставе вялізарных дасягненьняў рабочае клясы СССР у справе социялістычнага будаўніцтва ўрадам Саюзу ССР прыняты для падыходзячага 1931 г. больш высокія тэмпы разгортваньня народнае гаспадаркі, чым за першыя два гады пяцігодкі.

У мэтах забясьпечаньня правядзеньня пастаўленых задач социялістычнага будаўніцтва і організацыі праверкі фактычнага выкананьня дырэктыў ураду Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР лічаць неабходным прыняць усе захады к таму, каб узмацніць барацьбу з недахопамі дзяржаўнага апарату і ў асаблівасьці барацьбу з бюрократызмам, зьвязваючым растучую ініцыятыву рабочых мас і працоўных вёскі. Пры гэтым Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР будуць кіравацца ўказаньнем У. І. Леніна аб тым, каб „цэнтр цяжару перанесьці на падбор людзей, на праверку фактычнага выкананьня".

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР лічаць, што праверка выкананьня і зьвязанае з гэтым узмацненьне савецкай дысцыпліны зьяўляецца адной з важнейшых задач кіраўніцтва справай будаўніцтва социялізму.

Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляюць:

1. Устанавіць побач з існуючымі асноўнымі дзьвюма камісіямі Савету Народных Камісараў Саюзу ССР—Саветам Працы і Абароны і Дзяржаўнай плянавай камісіяй—трэцюю сталую камісію Савету Народных Камісараў Саюзу ССР, прысвоіўшы ёй назву „КАМІСІЯ ВЫКАНАНЬНЯ".

2. Асноўнымі задачамі камісія выкананьня лічыць: праверку фактычнага выкананьня дырэктыў ураду і ўзмацненьне дысцыпліны ва ўсіх дзяржаўных, і ў тым ліку гаспадарчых, організацыях, зьверху да нізу.

3. Вызначыць камісію выкананьня ў складзе: старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР (старшыня камісіі выкананьня) В. М. Молатава (Скрабіна), намесьніка старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Наркома Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі А. А. Андрэева (намесьнік старшыні камісіі выкананьня), сакратара ЦК УсеКП (бальшавікоў) П. П. Постышава, сакратара Ўсесаюзнага Цэнтральнага Савету Профэсыянальных Саюзаў Н. М. Шварніка і старшыні Ўсесаюзнага саюзу сельскагаспадарчых колектываў (Колгасцэнтру) Т. А. Юркіна.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту
Саюзу ССР **М. І. Калінін.**

Старшыня Савету Народных Камісараў
Саюзу ССР **В. М. Молатаў (Скрабін).**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту
Саюзу ССР **А. Енукідзе.**

Масква. Крэмль, 24 сьнежня 1930 г.

КЛЯСА СУПРОЦЬ КЛЯСЫ

„Комунізм выганяе на вулічныя дэмонстрацыі"

БЭРЛІН, 25. Як і заўсёды, нямецкія буржуазныя газэты друкуюць у сёньнешніх калядных нумэрох гадовыя агляды, якія насычаны самым глыбокім пэсымізмам, адлюстроўваючы перажываемы Нямеччынай нябывала цяжкі экономічны і політычны крызіс.

Асабліва характэрна ў гэтым стасунку выказваньне кіруючых буржуазных газэт. „Франкфуртэр Цэйтунг" піша: „Надта многа зруйнавана і дзеля гэтага перад кожнай магчымасьцю адшукаць выхад напісана слова: „цярпеньне". „Бэрлінэр Бэрзэнцэйтунг" адзначае, што Нямеччына „сьвяткуе каляды перад тварам нарастаньня беспрацоўя да лічбы ў 4 мільёны". У заключэньне гэтага піша: „Занадта вялікім стала ўбоства, нянавісьць разьдзірае нямецкі народ. Комунізм выганяе ў Бэрліне сваіх прыхільнікаў на вулічныя дэмонстрацыі. Ці-ж гэта не паказвае, што ў нас няма больш месца для каляднага міру".

Прускі міністр народнай асьветы, социял-дэмократ Грымэ апублікаваў у „Форвэрстэр" артыкул з цытатамі з эвангельля і Толстога. Гэтую пацыфічную каляднуюбязглуздзіцу Грымэ заканчвае словамі: „Мы ня ведаем, што нам прынясе наступны год. На вуліцах крычыць убоства і беспрацоўе". „Роте Фанэ" піша: „Брунінгі, Браўны, Зэвэрынгі і Фрыкі падалі галадаючым працоўным масам к калядам 1930 году драцяныя загарадзі. Гурагапны агонь—па драцяных загарадзях, якія паставіў навокал сябе, для абароны ад мільёнаў галодных мас, капіталістычны лад. Чырвоныя піонэры, наперад! Пракладайце дарогу праз драцяныя загарадзі!"

Прадпрыемцы наступаюць на галодны заробак рабочых

ПАРЫЖ, 19. Француские прадпрыемцы, спасылаючыся на прыклад прадпрыемстваў іншых краін пачынаюць кампанію за зьніжэньне зарплаты французскім рабочым.

Орган цяжкое прамысловасьці „Юзін" апублікаваў артыкул, якім імкнецца давесьці, што французскія рабочыя атрымліваюць занадта высокую зарплату". „Ці ж нашы мы занадта далёка ў сэнсе павышэньня зарплаты,—піша газэта,—калі прыняць пад увагу нашы экономічныя патрэбы і міжнародна становішча?". „Ва ўсякім выпадку—заключае газэта,—ад гэтага часу павышэньне зарплаты стала ў нас немагчымай рэччу".

Да новых перамог на колгасным фронце

„...Выкананьне пляну ў галіне колектывізацыі дасьць абсолютную перавагу соцыялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі элемэнтамі ў вёсцы, замацуе змычку рабочае клясы з працоўнымі масамі сялянства і закончыць пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі СССР. Гэта будзе перамога сусьветна-гістарычнага значэньня“.

(Сьнежаньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Вядучы ўдарную падрыхтоўку да комсамольскіх зьездаў і другой бальшавіцкай вясны забясьпечым і ўзмоцнім колгасны прыліў

У падарунак Х-му зьезду ЛКСМБ

Дрычкаўская ячэйка Смілаўскага раёну па ўдарнаму праводзіць работу па організацыі новага прыліву ў колгасы. Так, па ініцыятыве ячэйкі, за лістапад месяц організаваны 2 новыя колгасы—„Батрак“ і імя „Будзённага“,—у якія ўступіла каля 20 гаспадарак. У старых колгасах маецца таксама прыліў. Так, напрыклад, у колгас „Новы Сьвет“ уступіла 2 гаспадаркі, у колгас „Рабочы“—5, у колгас—„Пяцігодка“—5.

Янкавец.

У барацьбе за новы колгасны прыліў

Большасьць вясковых комсамольскіх ячэек Полацкага раёну разгарнулі даволі шырокую работу па організацыі новага колгаснага прыліву. У гэтай галіне комсамольская організацыя раёну мае значныя вынікі. Так, комсамольская ячэйка колгасу „Кастрычрік“ паказала вузор сапраўды комсамольскай работы, як у колгасе, так і па-за ім. Комсамольцы правялі 7 суботнікаў па ўборцы, 2 суботнікі па дапамозе бядняцкім гаспадаркам, 5 сходаў моладзі і 5 сялянскіх сходаў па пытаньням колектывізацыі. У выніку—колгасны плян сяўбы перавыкананы на 78 проц., у колгас уцягнута 5 новых гаспадарак і організавана 1 аддзяленьне колгасу.

Па ініцыятыве ячэйкі ўсе колгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі па правядзеньню колгаснага будаўніцтва.

Комсамольская ячэйка колгасу імя Сталіна правяла 12 сялянскіх сходаў, вынікам якіх зьявіўся прыліў 15 гаспадарак і організацыя новага колгасу ў в. Булыгі.

Акрамя гэтага, у кожнай вёсцы якая знаходзіцца недалёка ад колгасу „Сталіна“, створаны ініцыятыўныя групы па організацыі колгасаў.

Чырвона-Шляхаўская ячэйка правяла 10 сходаў сялянства, на якіх популярызавала дасягненьні свайго колгасу. Вынікам гэтай работы зьявіўся новы колгасны прыліў і організацыя 3 ініцыятыўных груп па колектывізацыі.

У Дамнікоўскім сельсавеце, дзякуючы актыўнаму садзейнічаньню комсамольцаў, колгас імя К. Маркса вырас на 7 новых гаспадарак.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што асноўная частка раённай комсамольскай організацыі не стаіць у баку ад практычнага ажыцьцяўленьня сёньнешніх задач па рабоце на вёсцы.

У раёне ствараюцца ініцыятыўныя групы па колектывізацыі, організоўваецца новы колгасны прыліў і на гэтым фронце, як і на астатніх франтох комсамольцы зьяўляюцца адданымі, вернымі дапаможнікамі партыі.

Словамі конкрэтных лічбаў і прыкладаў разьбіваюцца брудныя паклёпы правых опортуністых—Целешава, Бутыркіна, Гузава—аб адсутнасьці актыўнасьці мас аб „крызісе актыву“ і г. д.

Бязумоўна, на гэтым нельга супакоіцца. Побач з дадатнымі прыкладамі мы маем яшчэ і прыклады бязьдзейнасьці паасобных ячэек, нядбайныя адносіны іх да організацыі колгаснага прыліву. Вузорам нядбайнасьці і бязьдзейнасьці зьяўляецца комсамольская ячэйка колгасу „Трактар“, якая нічога не зрабіла для таго, каб уцягнуць аднаасобнікаў у колгас.

Румянец.

У адказ інтэрвэнтам працоўныя Любаньшчыны ўступаюць у колгасы

У сувязі з працэсам, які адбываўся па справе „Прампартыі“, а таксама выкрыцьцём контр-рэволюцыйнай організацыі беларускіх нацдэмаў, па Любаньскім раёне адбыліся сходы. Працоўнае сялянства, у адказ інтэрвэнтам і іх лёкаям—беларускім нацыянал-дэмократам—уступаюць у старыя колгасы і організоўваюць новыя. Так, за апошні час у Тураўскім сельсавеце, сіламі комсамольскай ячэйкі організаваны два колгасы. У вёсцы Сарачы, Любаньскага сельсавету організаваны колгас „Чырвоная Зьмена“ з 16 гаспадарак. Адначасова ў гэтай-жа вёсцы організавана першапачатковае жывёлагадоўчае таварыства, у якое ўступіла 30 гаспадарак.

Кюх.

Рапартуем аб праведзенай рабоце па колектывізацыі

(Палянская комсамольская ячэйка)

У мэтах найлепшага ўцягненьня бядняцка-серадняцкіх мас у колгасы пры ячэйцы была створана ініцыятыўная група з 7 асоб, з якіх 4 комсамольцы і 3 беспартыйныя. Пасьля гэтага ячэйка організавала колгас, у які ўступіла 103 гаспадаркі.

Ініцыятыўнай групай уцягнута 7 гаспадарак у існуючыя колгасы.

Па ўнутры-колгаснаму будаўніцтву ўсе комсамольцы Палянскага колгасу абвясьцілі сябе ударнікамі па ўвесь час работы—з вясны да восені. Па ініцыятыве ячэйкі былі організаваны 4 брыгады з 47 чалавек. Праводзіліся сходы ўдарнікаў, дзе абгаварваліся пляны працы ўдарных брыгад.

Ячэйка організавала 3 чырвоныя абозы, якія здалі каля 8 тон хлеба.

Барсукова.

Бальшавіцкая ўборка перакапала

Дзякуючы добрай організацыі працы і разьмеркаваньню ўраджаю ў колгасе „Чырвоная Зьмена“, Клічаўскага раёну, назіраецца вялікі прыліў сялян-аднаасобнікаў з акаляючых вёсак. За апошні час у колгас уступіла 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Мяцёлка.

Напярэдадні суцэльнай колектывізацыі

Уладзіміраўскі сельсавет, Клічаўскага раёну, знаходзіцца напярэдадні суцэльнай колектывізацыі. У сельсавеце налічваецца 6 колгасаў, г. зн. амаль у кожнай вёсцы—колгас. Дзякуючы добрай працы і добрым вынікам разьмеркаваньня ўраджаю, у колгас №-кай стралковай дывізіі ўступіла ўся веска Курганы. Вёска Мікалаеўка цалкам уліласа ў колгас „Калінаўка“.

Стальны.

Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі

Па ініцыятыве комсамольскай ячэйкі і настаўнікаў Вільчанскай ШКМ, Койданаўскага раёну, у в. Вільшчына організаваны колгас, у які ўступіла 10 гаспадарак. **П. К.**

Рыхтуемся да другой бальшавіцкай вясны



На здымку: Ачыстка насеньня ў колгасе „Новае Жыцьцё, Самахвалавіцкага раёну.

„Другую бальшавіцкую вясну сустрэнем па-ўдарнаму“

У канцы кастрычніка ў в. Старое Сяло, па ініцыятыве партыйнай і комсамольскай ячэйкі Пліскага сельсавету, організаваны колгас з 56 гаспадарак, пад назвай „Красіна“. У час правядзеньня сходу бедната актыўна выступала за організацыю колгасу і давала належны адпор кулакам і падкулачнікам, якія імкнуліся сарваць організацыю колгасу. Колгас ужо прыступіў да абагульваньня інвэнтара і стварае насенныя фонды.

—Другую бальшавіцкую вясну сустрэнем па ўдарнаму,—так гавораць колгасьнікі.

Грыдзюшка.

Колгас „Пералом“ у в. Адамава

10-га сьнежня ў в. Адамава, Грэскага раёну, на сходзе па пытаньню аб выгаднасьці колектыўнай гаспадаркі 12 гаспадарак гэтай вёскі ўступілі ў колгас. У той-жа самы вечар быў зацьверджан статут, абрана праўленьне і рэв. камісія, колгасу далі назву „Пералом“.

С. Голас.

„Чырвоная Зьмена“ ў Віцебску

Бязьлітасна змагацца з усімі, хто імкнецца ў тэорыі і практыцы цягнуць комсамол у опортуністычнае балота

КОМСАМОЛЬЦЫ АКУЛЯРНАЙ ФАБРЫКІ! Хто даў вам права ўступаць у трэці рашаючы год з прарывам?

У палоне опортуністычнай практыкі

Аб беларусізацыі ў Віцебску друк пісаў досыць багата. Факты ігнараваньня беларускае мовы органамі сувязі досыць памятны. Тэлефонная станцыя адмаўлялася адказваць на беларускай мове, у віцебскіх газэтных кіёсках ніколі ня знойдзеш „Чырвоную Зьмену“ ні іншых газэт беларускіх выданьняў.

Што-ж робіць комсамольская ячэйка пры канторы сувязі, як яна змагаецца за ажыцьцяўленьне рашэньняў партыі аб беларусізацыі?

Прыходзім на сход ячэйкі. На парадку дня стаяць тры пытаньні: Аб перавыбарах Гарсавету, аб месячніку ашчаднасьці і рознае. Дакладчыкі па першых двух пытаньнях не зьявіліся. Сэкратар ячэйкі становіцца ў позу і кажа:

— Партыйная ячэйка сарвала нашу работу. Сход павінен вынесьці рашэньне... я гаварыў, але яны ня прыслалі... Трэба прыступіць да пытаньня аб аглядзе.

Пачаліся спрэчкі па пытаньню становішча ячэйкі. У гэтых спрэчках высьветлілася, што ячэйка зусім адарвана ад гаспадарчай працы і жыцьця канторы сувязі. Сходы праходзяць надзвычайнай сумна і суха. Бюро ячэйкі на чале з сакратаром, тав. Юнчыцам, ня здольна было скласьці актыў, кіраваць ячэйкай. Юнчыць кажа:

Надта цяжка працаваць. У нашай ячэйцы зусім няма актыву. Усё „мёртвыя душы“. Я адзін у полі ня воін. Я організую вам гурткі, толькі вы наведвайце. У нас налічваецца 25 чалавек, але 20 з іх—на паперы. Ячэйку трэба расформаваць, бо я справіцца не магу.

Ізноў ідуць спрэчкі.

З спрэчак высьвятляецца, што кіраўніцтва ячэйкі ня хоча працаваць, а сэкратар яч. Юнчыц гэты „горапрарок“ права опортуністычнага лягеру, енчачы аб крызісе актыву, прывёў ячэйку да развалу.

Культэстафэта загрузла, не пасьпеўшы крануцца з месца. Комсамольцы аб ёй ня ведаюць. Адна комсамолка кажа, што фініш ужо адбыўся(?) а ў нас яшчэ старту ня было(?!).

Вытворчыя манэўры, якія праходзяць па органах сувязі, ячэйку не закранулі. Рашэньні Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б не прапрацаваны. Да зьезду комсамолу выпісалі... 23 экзэмпляры „Чырвонай Зьмены“ і толькі.

Аб росьце ня думаюць. За 4 месяцы ўступіла 7 чалавек, ды і то самапёкам. Піонэрскі атрад развалены, з Чырвонай арміяй сувязі ня трымаюць.

Паўстае пытаньне аб актыве.

— Тав Юнчыць! Што ты зрабіў, як сэкратар, для стварэньня актыву?

Юнчыць маўчыць, потым кажа:

— Давай вымовы...

Сыгналізаваў у сваіх выступленьнях аб „крызісе актыўнасьці“.

Опортуністы Юнчыць давёў да канца сваю тэорыю аб тым, што толькі ён адзін працуе і больш ніхто. Гэта ён угробіў працу. Калі пыталіся ў яго аб паседжаньні бюро, ён рэзка абрываў:

— Не твая справа, з цябе нічога ня будзе...—і працягваў вымовамі рыхтаваць актыў.

* * *

Гэты сход быў досыць характэрным. Ён паказаў, што значная доля віны за прарывы ў органах сувязі падае на комсамольскую ячэйку.

Ніякай кульмасавай працы сярод працаўнікоў сувязі не праводзіцца. У клюбе цёмна, сыра і холадна. На сьцяне вісіць толькі плякат аб кастрычнікавай гадавіне. З клюбнай бібліотэкі толькі гэтымі днямі выключаны чужыя, варожыя нашай сучаснасьці кнігі. Новых, сучасных кніг няма. Аб беларускай літаратуры і гутаркі быць ня можа.

Комсамольская ячэйка канторы сувязі, пры яўна опортуністычным кіраўніцтве, бяз сталага парт. кіраўніцтва, у палоне асабістай грызаніны і калатні адарвалася ад жыцьця, не заняла адведзенае ёй адказнае месца ў сыстэме нашай гаспадарчай працы.

Гарадзкі камітэт комсамолу павінен заняцца ячэйкаю, аздаравіць яе кіраўніцтва і даць конкрэтны напрамак у яе рабоце.

Ячэйцы неабходна зараз выправіць допушчаныя праваопортуністычныя памылкі і прыступіць да конкрэтнай барацьбы за палепшаньне працы органаў сувязі, за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі ў гэтай галіне. Бязьлітасна змагацца з усімі, хто імкнецца ў тэорыі і практыцы цягнуць комсамол у опортуністычнае балота.

Л. Глезэр.

За рэзолюцыямі ня бачылі сапраўднасьці

6 сьнежня, на сходзе комсамольскага колектыву акулярнай фабрыкі, бюро ячэйкі адчытвалася за сваю працу.

Справаздача і спрэчкі далі яскравы малюнак марудна сьці ў мобілізацыі мас на барацьбу з правым ухілам і „левымі“ загібамі, вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам і шовінізмамі ўсіх колераў.

Уся работа бюро ячэйкі зьмяшчалася ў выпрацоўцы рэзолюцый і пастаноў, выкананьнем якіх ніхто не займаўся.

Правядзеньне месячніку вытворчых манэўраў на комсамольскім сходзе абгаварвалася праз 6 дзён пасьля пачатку манэўраў. Колдагаворная кампанія прашла пры ўдзеле толькі паасобных комсамольцаў, а ня ўсёй комсамольскай масы.

Яшчэ ня ўсе комсамольцы ахоплены падпіскай на пазыку „Пяцігодка—у чатыры гады“.

Прапрацоўка пастаноў XVI партыйнага зьезду і адозва ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня прашла слаба.

Работа праводзіцца бясплянава. Адсутнічае вучот комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Няма вучоту ўдарнікаў. Нікому невядомы якасныя паказчыкі ўдарнікаў на прадпрыемстве. Контрактацыя за вытворчасьцю да канца пяцігодкі прашла агульнай пастановай і ня была аформлена падпіскай кожнага комсамольца паасобку.

Бюро ня прыцягвала да адказнасьці комсамольцаў - прагульшчыкаў. Так, комсамолец Казьлянскі прагуляў 2 дні, а бюро не рэагавала.

Аб дысцыпліне ў нашай ячэйцы гавораць ужо ня першы год на бюро, сходах, пленумах, конфэрэнцыях. Аднак і да гэтага часу некаторыя комсамольцы не адчуваюць адказнасьці за прабываньне ў шэрагах комсамолу. Вось факты, з-за няяўкі комсамольцаў сарваліся 3 сходы, сяброўскія ўзносы ня плаціць па 7 і больш месяцаў, невыкананьне даручаных нагрузак—зусім нормальнае зьявішча.

Бюро ня ўцягвала комсамольцаў у штодзённую работу ячэйкі, абмяжоўваючыся старым „патэнтаваным“ актывам, не працавала з беспартыйнай моладзьдзю. У колектыве 250 чалавек, а ў комсамол за апошні год уступіла толькі 16.

Партколектыў не кіраваў работай комсамольскай ячэйкі.

Кіраўніцтва піонэр-атратрадам было зусім слабое. Пастанова ЦК і бюро гаркому комсамолу аб баявым аглядзе піонэр-організацыі ячэйкай не прапрацавана і не рэалізавана.

У пастанове па справаздачы бюро сход адзначыў усе гэтыя моманты і прапанаваў новаму бюро бальшавіцкімі тэмпамі ўзяцца за выпраўленьне прарываў у рабоце ячэйкі.

Выкананьне гэтай пастановы павінна стаць справай кожнага комсамольца. Толькі пры актыўным удзеле ўсёй комсамольскай масы бюро колектыву справіцца з кіраўніцтвам і выправіць допушчаныя памылкі.

Лепшым падарункам Х зьезду ЛКСМБ і IX зьезду УсеЛКСМ будзе актыўная барацьба комсамольцаў за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну і ліквідацыю прарываў у працы фабрыкі і ячэйкі.

Роза Цвэй.

Выканалі прамфінплян ударнага кварталу

25-га сьнежня г. г., а 5-й гадзіне ўвечары, на Менскай Шчаціннай фабрыцы было закончана выкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу. У выніку энтузіязму прамфінплян выканан не на 3 дні, як меркавалася, а на 5 дзён раней.

Рабкор Хлененбаум.

НА СЬЦЯГІ ШТУРМУ—ЛЁЗУНГ ПЕРАМОГ

Прамполітбоем, плянава-опэрацыйнымі групамі, ажыцьцяўленьнем рабочых прапаноў-пачнем новы гаспадарчы год

СУСТРЭНЕМ 3-ЦІ ГОД ПЯЦІГОДКІ МАГУТНЫМ ПРЫБОЕМ КОМСАМОЛЬСКАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Напярэдадні рашаючага

Апошнія дні ўсесаюзнага конкурсу і барацьбы за атрыманьне сьцягу ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ за лепшае выкананьне прамфінпляну ударнага кварталу і падрыхтоўкі да 3-га году пяцігодкі зьяўляецца рашаючымі днямі ў справе баявой падрыхтоўкі да 3-га году пяцігодкі.

Выкананьне прамфінпляну 2 году і ўдарнага кварталу ёсьць гарантыя выкананьня пяцігодкі ў 4 гады.

Шэраг заводаў, якія ня выканалі прамфінпляну другога году пяцігодкі, гэроічным напружаньнем волі партыі і пролетарыяту дабіліся выкананьня пляну ўдарнага кварталу. Яскравым прыкладам служыць шклозавод „Домбаль". Грамадзкі буксір, вытворчыя манэўры, ужываньне ўсіх вышэйшых форм соц. спаборніцтва далі магчымасьць заводу паказаць бліскучую перамогу на фронце барацьбы за прамфінплян.

Баявое правядзеньне дзесяцідзённай праверкі падрыхтаванасьці і генэральнага агляду выкананьня прамфінпляну па ўсіх заводах і фабрыках—гарантыя таго, што пад кіраўніцтвам партыі наша прамысловасьць справіцца з задачамі, ускладзенымі на яе ў трэцім годзе пяцігодкі.

Перад вытворчымі організацыямі комсамолу зараз ва ўсю шырыню стаіць задача мобілізацыі ўсёй сваёй ініцыятывы на падрыхтоўку да 3-га году пяцігодкі.

Наперакор упэўненьням гора-прарокаў аб крызісе актыўнасьці ў комсамоле, вытворчыя колектывы высоўваюць усё новыя і новыя формы соц. спаборніцтва.

Пачынаньне комсамольскага колектыву фабрыкі „Кастрычнік"—правядзеньне прампалітбаёў—зьяўляецца карыснай формай у справе накіраваньня комсамольскай ініцыятывы на баявое выкананьне прамфінпляну. Іменна цеснае і поўнае злучэньне работы па выкананьню прамфінпляну з падняцьцем політычнага ўзроўню мас комсамольцаў і глыбокім вывучэньнем рашэньняў 16 партзьезду і Кастрычніцкага Пленуму ЦК КП(б)Б ёсьць гарантыя пасьпяховага пачатку і правядзеньня 3-га году пяцігодкі.

Адна з асноўных умоў баявой падрыхтоўкі да новага гаспадарчага году, гэта—пытаньне правільнага плянаваньня ўнутры заводу.

Гэты вучастак работы—адзін з найбольш адсталых у барацьбе комсамолу за прамфінплян. Аўладаць гэтым вучасткам, організаваць плянава-опэрацыйныя групы ў кожным цэху кожнага заводу—баявая задача комсамолу.

Рацыяналізацыя прадпрыемстваў, збор і поўнае выкарыстаньне рабочых прапаноў, над якімі ўзялі зараз шэфства комсамольскія організацыі, зьявяцца лепшым дапаможнікам у выкананьні прамфінпляну 3-га году пяцігодкі.

Перамога „домбалеўцаў"

Доўгі час партколектыў, фабком і колектыў ЛКСМБ фабрыкі „Домбаль", засядалі і разглядалі „міжнародныя пытаньні", ня бачачы, як тут-жа пад бокам развальваліся комсамольскія ячэйкі, як паглыбляліся прарывы ў выкананьні прамфінпляну, падала соцспаборніцтва, расла колькасьць ілжэўдарнікаў, прастояў і г. д.

У мінулым годзе завод не дадаў на 50 тысяч рублёў прадукцыі, з якое амаль адна трэцяя частка—экспортная. Чорная пляма навісла над заводам. Прарывы расьлі і расьлі. А заводзкія організацыі ўсё засядалі...

Але загаварыў друк. Заварушыліся організацыі, загаварылі рабочыя. Усе былі накіраваны на ліквідацыю прарываў.

Ад прарыву да перамог

Ужо 6 гадзін. Паступова пакойчык завкому запаўняецца чорнымі ад копаці людзьмі. Гэта штабістыя прышлі на пасяджэньне штабу па вытворчым манэўрам. Тут гавораць аб трывожных лічбах, аб невыкананьні прамфінпляну, аб вялікім проценце браку.

Брак і бой будуць зьнішчаны, калі цягнульшчыкі ўважліва адносяцца да вытворчасьці, калі адносчыцы ня будуць біць шкло, калі шліфоўшчыцы будуць уважліва сачыць за працай. Тут-жа быў унесены шэраг прапаноў па палепшаньню якасьці і зьнішчэньню бою.

Разам з разгорнутай працай заводзкіх організацый—рос энтузіязм рабочых. Вось мэханічны цэх організаваў 4 ударныя брыгады, амаль 100 проц. рабочых шліфоўні № 1 закантрактаваліся за заводам. Комсамольскі колектыў організаваў комсамольскія варштаты, якія выраблююць 2700 шклянак у той час, калі норма—2000. Організаваны скразныя брыгады, батальёны энтузіястых і г. д.

Дзякуючы праведзеным вытворчым манэўрам—прамфінплян быў перавыкананы.

У барацьбе за ліквідацыю прарыву

Гомсельмаш уключыўся ў генэральны агляд, які праводзіцца газэтай „Зьвязда", ЦСПСБ і ВСНГБ.

На тэрміновай нарадзе бюро партыйнага і комсамольскага колектыву сумесна з завкомам быў выпрацаваны спэцыяльны плян работы на працягу агляду.

Комсамолія і рабочая моладзь заводу мобілізавалася на выкананьне прамфінпляну. У дапамогу па ліквідацыі прарыву „лёгкая кавалерыя" выкрывае шэраг вытворчых недахопаў. На працягу агляду яна вывучыць прычыну браку і пакажа вузорнасьць у палепшаньні якасьць продукцыі.

Для зьнішчэньня галоўнай хваробы заводу—бяспляновасьці, паміж цэхамі організаваны плянава-опэрацыйныя групы з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі. Організавана спэцыяльная брыгада ў дапамогу дырэктару.

У бліжэйшы тэрмін будзе організавана скразная брыгада і праверацы ўдзел кожнага комсамольца ў агульна-гарадзкім конкурсе.

На заводзе створана адна агульна-гарадзкая брыгада і 6 цэхавых. Трэба спадзявацца, што Гомсельмаш, які зараз стаіць амаль на апошнім месцы па выкананьні прамфінпляну, у час агляду шэрагам практычных мерапрыемстваў даб'ецца выкананьня і перавыкананьня сваёй праграмы, як у колькасных, так і ў якасных паказчыках.

КУДРАЎСКІ.



Комсамольцы-ударнікі за рамонтам паравоза

Уступайце ў прамполітбой

Адкрыты ліст

Ленінскаму комсамолу заводаў „Комунар", „Бальшавік", Гомельскай і Віцебскай швэйным фабрыкам

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

1-га студзеня 1931 году пачынаецца новы гаспадарчы год, які зьявіцца рашаючым годам у выкананьні пяцігодкі ў 4 гады. Комсамольскі колектыў чырв наштандартнай швэйнай фабрыкі „Акцябр" рашыў сустрэць новы год новым комуністычным мэтадам працы—прамысловым політбоем.

З мэтай выканаць і перавыканаць прамфінплян трэцяга, рашаючага году, пяцігодкі і падняць культ. політузровень комсамольцаў і рабочы колектыў, ЛКСМБ уступае 1-га студзеня ў прамполітбой і выклікае на соцспаборніцтва комсамольскія колектывы заводу „Комунар", „Бальшавік", Гомельскую швэйную фабрыку „Комінтэрн" і Віцебскую швэйную фабрыку „Профінтэрн" па наступных пытаньнях:

1. З пераходам на новы летні сэзон забясьпечыць выкананьне прамфінпляну ў студзені і лютым;
2. Другому комсамольскаму агрэгату закончыць програму асобнага кварталу да 25 сьнежня;
3. Цэхавым ячэйкам вылучыць брыгады моладзі па праверцы падрыхтоўкі да пераходу на новы сэзон;
4. Цэхавым ячэйкам сачыць, каб ня было прагулаў і спазьненьняў сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі;
5. Вылучыць тройкі па агрэгатах для дапамогі ў правядзеньні вытворчых манэўраў. Забясьпечыць актыўнасьць комсамольцаў і беспартыйнай моладзі
6. Цэх'ячэйкам організаваць ударныя брыгады моладзі імя X зьезду ЛКСМБ;
7. Да 30-XII закончыць кантрактацыю комсамольцаў і моладзі на заводах;
8. У комсамольскім агрэгаце правесьці прамполітбой, уцягнуўшы ўсіх рабочых агрэгату. Пры правядзеньні прамполітбою дабіцца падняцьця політузроўню комсамольцаў і беспартыйных рабочых. Асноўнымі пытаньнямі паставіць рашэньні XVI зьезду партыі і Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Заняткі па прапрацоўцы гэтых матар'ялаў правесьці пад знакам соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, забясьпечыўшы ўдзел усіх комсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

У час правядзеньня прамполітбою ўсім цэх'ячэйкам выявіць лепшых ударнікаў з беспартыйнай моладзі, з мэтай уцягнуць іх у шэрагі комсамолу. Цэхячэйкам організаваць брыгады моладзі для збору рабочых прапаноў да новага колдагавору і для праверкі наведваньня комсамольцамі школы.

За лепшае правядзеньне прамполітбою прэміяваць цэх'ячэйкі.

Па сканчэньні прамполітбою заслухаць вынікі яго на вечары моладзі.

Чакаем вашага адказу.

Бюро комсамольскага колектыву чырвонаштандартнай фабрыкі „Акцябр".

Рабочая сьмякалка ў дзейнасьці

Цэнульня. Тут шмат новага. Вось новы варштат. Шліфоўшчык раней прыводзіў яго ў рух нагамі, а цяпер машынай. Раней шкло ў каруселі рэзалі алмазам, цяпер-жа дзякуючы вынаходзтву рабочых Кляко і Станкевіча, станок прыстасаваны так, што рэжа шкло мэханічна. Ад гэтага зьменшыўся бой на 50 проц., вытворчасьць працы павялічылася на 60 проц.

Амаль усюды што-небудзь новае з рабочай сьмякалкі.

Пры выхадзе кідаецца ў вочы дыяграма аб ходзе выкананьня прамфінпляну. Яна запаўняецца кожны дзень. Але цікава—прамфінплян скача то ўверх, то ўніз. Вось 12-XII было 110,7 проц. выкананьня прамфінпляну, а 14-XII —78 проц.

У чым прычына? „Донсода", якая забясьпечвае завод галоўнай сыравінай—содай, ня выконвае ўзятых на сябе абавязацельстваў. Завод патрабуе 5 вагонаў соды, а даюць 4, ды і гэтыя прыбываюць несваечасова. Гэта зрывае выпуск экспортнай продукцыі і выкананьне прамфінпляну. Ніякія тэлеграмы, лісты, нават выезд працаўнікоў заводу не дапамагаюць.

Нугель.

Рапартаваць перавыкананьнем наметак ударнага кварталу

Комсамол Фрунзэўкі мобілізаваў усе свае сілы на перавыкананьне пленаў ударнага кварталу. Організацыя яшчэ мацней згуртавалася на выкананьне гаспадарчых задач. Вытворчыя ячэйкі ў штодзённай сваёй працы займаюцца пытаньнем выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Мэтодам організацыі ўдарных брыгад, давядзеньня прамфінпляну да варштатаў комсамолія дабілася вялікіх посьпехаў у гэтым напрамку. Завод „Комунар" за кастрычнік месяц выканаў прамфінплян на 101,8 проц., за лістапад месяц гэты-ж завод выканаў прамфінплян на 100,4 проц. За 15 дзён сьнежня—прарыў. Ліцейны цэх выканаў свой прамфінплян толькі на 86 проц., кавальны цэх на 66 проц. Комсамольская організацыя мобілізавала ўсю рабочую масу на ліквідацыю прарыву.

Комсамольскі агрэгат заводу „Беларуска" выканаў прамфінплян больш, як на 100 проц., за 16-ае сьнежня прамфінплян выкапан на 123 проц., а за 7-ае—на 125 проц.

Фабрыка „Акцябр" за лістапад месяц перавыканала свой прамфінплян. Так, першы агрэгат выканаў прамфінплян на 104,2 проц., комсамольскі агрэгат—на 105,27 проц., трэці агрэгат—на 101,1 проц. Комсамольцы ідуць уперадзе.

Есьць і такія заводы, дзе сустрэчны прамфінплян не прапрацаваны, рабочая маса не мобілізавана на ліквідацыю прарываў, да такіх трэба аднесьці фабрыку „Комунарка", зав. „ДА", якія цягнуцца ў хвасьце. Тут прамфінплян недавыкананы. Комсамольская організацыя не мобілізавала рабочую масу на ліквідацыю прарыву.

18-га сьнежня пленум Фрунзэўскага райкому комсамолу адзначыў: „організацыя раёну скарыстала сустрэчны прамфінплян як вышэйшы мэтод соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, для мобілізацыі ўсёй комсамольскай масы і беспартыйнай рабочай моладзі на павялічэньне праграмы трэцяга году пяцігодкі".

Разам з гэтым, пленум адзначыў недапушчальныя адносіны шэрагу ячэек і колектываў, якія да гэтага часу не прапрацавалі сустрэчны прамфінплян, пленум прапанаваў усім комсамольскім колектывам закончыць усю працу па прапрацоўцы сустрэчнага не пазьней 1-га студзеня.

На пленуме організацыі Белдзяржбуду і фабрыкі „Акцябр" дакладвалі, што з мэтай падняцьця продукцыйнасьці працы імі праводзяцца вытворчыя політбаі. Пленум Фрунзэўскага РК прапанаваў усім колектывам уключыцца ў правядзеньне вытворчых політбаёў, як вышэйшы мэтод соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

X-му зьезду ЛКСМБ Фрунзэўская комсамольская організацыя будзе рапартаваць аб сваім конкрэтным удзеле ў перавыкананьні намётак ударнага кварталу.

Г. Фрыд.

КУТОК КОНСУЛЬТАЦЫІ № 1

УМЕЦЬ БУДАВАЦЬ СЬВІНАРНІК ТАННА І ДОБРА

ЯК ПАБУДАВАЦЬ СЬВІНАРНІК

Правільны дагляд і карменьне сьвіней прыносяць пэўную карысьць толькі тады, калі тыя памяшканьні, дзе яны праводзяць некаторую частку жыцьця, задавальняюць запатрабаваньням біолегіі сьвіньні.

Пытаньне пабудовы сьвінарнікаў, як у нас, так і за межамі, распрацавана вельмі дрэнна. Паміж тым дрэнная пабудова сьвінарнікаў цягне за сабой вялікія страты ў сьвінагадоўлі.

Беларуская Цэнтральная Дасьледчая Сьвінаводчая станцыя, рэарганізаваная ў Навукова-Дасьледчы Інстытут сьвінагадоўлі, занялася вывучэньнем гэтага пытаньня і дала матар'ял, на падставе якога можна зараз даць тыповыя сьвінарнікі для будоўлі ў саўгасах і колгасах.

У пагоні за высокай продукцыяй чалавек імкнуўся наблізіць умовы жыцьця сьвіньні да тых умоў, у якіх ён знаходзіцца сам. Аднак, такія ўмовы для сьвіньні, акрамя таго што не патрэбны, дык яшчэ і шкодны.

Пры пабудова сьвінарніка трэба мець на ўвазе тры галоўныя фактары: сьвятло, сухасьць і цяпло. Акрамя гэтага, сьвінарнік павінен быць танны і зручны пры абслугоўваньні. Сьвятло зьяўляецца неабходным фактарам у жыцьці жывёлы, за гэтым трэба вокны ў сьвінарніку ставіць у даху з паўднёвага боку, пад кутом прыблізна ў 45°, каб прайшлі простыя праменьні ў сьвінарнік і асьвятлілі падлогу, столь, сьцены.

Другі фактар—сухасьць дасягаецца як будаўнічым матар'ялам, так і самай сыстэмай будаўніцтва. Лепшым матар'ялам будзе дрэва, у розных яго выглядах. Камень, бэтон, цэглу трэба адкінуць, як зусім нягодны матар'ял для будоўлі сьвінарніка, таму што ў каменных сьвінарніках сьвіньні хварэюць рэўматызмам і запаленьнем лёгкіх. Пытаньне ўплыву тэмпэратуры на сьвіней вельмі слаба высьветлена. Даныя Беларускай Цэнтральнай Дасьледчай сьвінаводчай станцыі кажуць, што чым вышэй тэмпэратура ў сьвінарніку, тым больш продант парасят хварэе белым паносам. Лепшая тэмпэратура ў апаросным сьвінарніку будзе 6°-10° С. Для ўтрыманьня парасят ад 10 дзён да 2-х месяцаў добрая тэмпэратура будзе 4°-8° С. Што тычыцца тэмпэратуры адкормачнага сьвінарніка, дык па нашых даных высокая тэмпэратура зусім не патрэбна, таму для адкорму магчыма дапусьціць 5°-10° С. пры добрым падсьціле.

Адкормачны сьвінарнік. Пляв.

Беларуская Цэнтральная Дасьледчая станцыя раіць будаваць два тыпы сьвінарнікаў: апаросныя і для адкорму і ўтрыманьня халастых матак. Гэтыя абодва тыпы сьвінарнікаў у адносінах сухасьці і сьвятла павінны быць аднолькавы, а ў адносінах цяплыні сьвінарнікі для апаросу павінны быць значна цяплейшымі чым для іншых сьвіней, дзеля гэтага апаросны сьві-


Другая чарга.


Той-жа сьвінарнік. Пляв.

нарнік трэба рабіць рублены, з бярвеньняў, а адкормачны, больш лёгкі—з дошак.

На пабудову апароснага сьвінарніка можа быць скарыстаны розны матар'ял старых будынкаў. Гэты матар'ял можна закідваць у шулы, як драўляныя, так і цагляныя, ці бэтонныя.

Апаросны сьвінарнік таксама можна рабіць і з дошак, з асыпкай торпу. Робіцца такі сьвінарнік на 96 станкоў, з падзелам усяго будынку на 2 часткі. Станкі ідуць у два рады, а пасярэдзіне—калідор, шырынёю ня менш, як 1,5 м. Станок мае плошчу 3,0×2,1 м. раўняецца 6,3 кв. м. Шырыня сьвінарніка—8 м. даўжыня—108,5 м., вышыня сьцяны 1,5 м., а ў вільчыку 3,5—4 м. Цёплая страха—столь складае адно цэлае, набіта торпам ці пяском. Сьвінарнік абавязкова будуецца на поўдзень вокнамі. Вокны робяцца ў даху пад кутом у 45°, прычым на прыгонку іх трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, каб яны не зацякалі. З паўднёвага боку з кожнага станка робіцца лаз у выгуле, даўжыня выгулу—10 м.

На бакох сьвінарніка робяцца тамбуры з шалёўкі, вэнтыляцыя ў гэтым сьвінарніку робіцца розная: муіра, кінга і проста з паўночнага боку ў выглядзе фортак, перагародкі ў станка павінны рабіцца з дзерава-рэдкія, з сухіх жордак. Ставяцца старчма, вышыня—1,25 м. Стаячыя і сухія перагародкі ня так грызуць сьвіньні. Лепш за ўсё ў станку рабіць карыта з крышкай 0,7 м. даўжыні, 0,3 шырыні і 0,2 вышыні.

Лепшай падлогай будзе драўляная—1,5 дзюймовых дошак. Пры пабудове падлогі трэба падсыпаць жужаль ці пясок, каб яна ня гніла. Цэмантную падлогу можна дапусьціць толькі ў калідоры, але ні ў якім разе ў станку, таму што на каменнай падлозе сьвіньні хварэюць раматусам.

Жыжа ў калідоры сьцякае па жалобках абапал калідору ў жыжа-адстойны калодзеж, якіх на такі сьвінарнік трэба мець 3, аб'ёмам у 8-10 мэтр. Кошт аднаго сьвінамесца ў такім сьвінарніку—184 рублі.

Сьвінарнікі для адкорму і для ўтрыманьня халастых сьвінам так каштуюць значна таней, таму што яны робяцца з шалёвак. Адно месца каштуе 35 рублёў. Дошкі на сьценах прыбіваюцца старчма, у разьбежку. Вышыня сьцен паўночнай—1,1 м., паўднёвай—1,5 м. Дах робіцца таксама з дошак, пакрытых толем ці гонтам. Калідор трэба рабіць з паўночнага боку 2,4 м. шырынёю, станкі робяцца ў адзін рад з паўднёвага боку—5,1×9,1, на 25 падсьвінкаў. ці на 18 халастых сьвінаматак. Усяго 12 станкоў. Вышыня, шырыня і даўжыня загарадак амаль такая, як і ў апаросным сьвінарніку. Вокны таксама робяць з паўднёвага боку, вэнтыляцыя ўтвараецца ці праз фортку, ці робяць трубы муіра. З паўднёвага боку робяцца лазы ў выгулы з кожнага станка, прычым выгулы пры гэтых сьвінарніках даўжынёй—20 м. На калідоры сьцелецца падлога драўляная, ці бэтонная, з аднаго боку станка робіцца падлога шырынёю—1,5 м., а астатняя плошча станка застаецца без падлогі і засыпаецца пяском. Сьвіньні трымаюцца на саломе. Утрыманьне сьвіней на подсьціле, а ня ў выграбленым сьвінарніку, на сьвінводнай станцыі паказала, што гэты спосаб зьяўляецца самым здаровым. Падсьцілу, пры ўтрыманьні сьвіней групамі, ідзе разы ў чатыры менш, чым пры выграбным утрыманьні. Кормяцца сьвіньні ў калідоры з аднаго карыта.

На першы погляд можа паказацца, што такія сьвінарнікі зьяўляюцца халоднымі, аднак-жа назіраньні паказваюць, што пры дастатковым подсьціле і ўтрыманьні групамі сьвіньні добра саграваюцца.

Будаўнічы бок проэктаў сьвінарнікаў БЦДС станцыі распрацованы Белколгасбудам.

Зубрыцкі.

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

* Сьмілявіцкі РК КП(б)Б паведамляе, што факты зьмешчаныя ў допісе „Опортуністыя разваліваюць колгас“, пацьвердзіліся. Райколгасу прапанавана правесьці чыстку ў колгасе „Юны Піонэр“.

* Па допісу „Яшчэ аб сталоўцы“ Барысаўская РСІ паведамляе, што ўжыты шэраг мерапрыемстваў для палепшаньня працы сталоўкі пры Стара-Барысаўскім сельгастэхнікуме.

* Акцыйнае таварыства „Белрыба“ з зваротам копіі заметкі „Нас заядаюць вошы“ паведамляе, што ў асноўным паказаныя ў заметцы факты аб дрэнным абслугоўваньні Жыткавіцкага рыбтэхнікуму пацьвердзіліся. Белрыбаю на месцы быў камандыраваны інспэктар па кадрах. Захады да выжыцьця ўсіх недахопаў прыняты і зараз становішча паляпшаецца.

* Начальнік Круглянскай раймiліцыі паведамляе, што па допісу „Убярэце хуліганаў“ зроблена дазнаньне і факты хуліганства пацьвердзіліся. Іваноў Яніка Тодараў і Агееў Сяргей, в. Цярэшына, прыцягнуты да адказнасьці па 107-б арт. К. К. Справа накіравана ў Нарсуд.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

Храпаву—„Харошае сьвінаводства“, Тодару Алесіну—„Будаўніцтва сьвінарнікаў на Капыльшчыне сарвана“, Т. А. — „Лятунства працягваецца“, Хамскаму—„Я дырэктар“, Боську—„З сьвіньнямі мы займацца ня будзем“, Капшавіцкаму—„Клясавыя ворагі працуюць“. Навальніцы—„Можа яшчэ пасьпеем“. Пліско—„Партыйная ячэйка сьпіць“ Піскуну—„Комсамольская ячэйка ў баку“. Кароньніку—„Плян бульбы перавышан“. Дубоваму „Вось дык старшыня“, Х-ГН—„Набраўшы ў рот вады маўчаць“, — дробязь, ня пойдуць, зьмяшчайце ў насьценгазэту.

Гарбару—„Ліст у рэдакцыю“, Пінчуку—„Па-бальшавіцку ўдарыць па лятунох“, П. А.—„Адлажылі райконфэрэнцыю“, Заліковічу—„Па-бальшавіцку перабудуемся“, Матырку—„Абяуемся і выканаем“, Шмагіну—„Культпраца сьпіць“, Ельяшэвічу—„Мы за чыстату партыі і комсамолу“, Кудрашу—„Выхаваўчае працы няма“, С. Ермаку—„Мопраўская ячэйка памерла“, Убачыўшаму—„Аб Рагачэўскіх курсах“.

Петрыку, Ракіце М., Казырэўскаму, Дальнікаву, Селькору-дэлегату, Кацэбу Р., К. Каролю, Астапенку, Гузману Г., Рабкору конфэрэнцыі, Усоўскаму Іншым. Вашы допісы аб раённых конфэрэнцыях ня пойдуць—спазьніліся. Часткі іх не падыходзіць да друку.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599